Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 3 Вільня, Нядзеля 24 Студзеня 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская Крыніца

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Нямецкая палітыка на Усходзе і Гітлер.

Нямеччына ў сваей усходняй палітыцы заўсёды дзяржалася правіла, што найкарысьней для яе будзе вялікая і разам з гэтым слабая Расея. Пры вялікасьці Расеі Нямеччына мае адзіны бяз ніякіх гранічных перагародак вялікі рынак для збыту сваіх фабрычных тавараў, а пры слабасьці Расеі можа зьвярнуць свае вочы толькі на захад, на Францыю. Гэткага пагляду дзяржаліся немцы аж да самай вайны.

У часе эўрапэйскай вайны немцы пачалі зьмяняць свае пагляды: вялізарная Расея, хоць была ім і не страшная з боку мілітарнага, то ўсёжтакі адцягвала шмат войска для абароны даўзёрнага ўсходняга фронту. Каб неяк скараціць гэты фронт і звольніць свае дывізіі, якія гэтак былі патрэбны на заходнім фронце, Нямеччына пачынае будаваць „незалежныя“ дзяржавы: Польшчу, Літву і ўрэшце Украіну. Але ад кожнай дзяржавы яна вымагае вайсковай помачы, з тым, каб гэтую помач ськіраваць проціў Расеі. Калі-ж ані ў Польшчы, ані ў Літве да гэтай помачы не сьпяшаліся, нямецкі ўрад у запломбаваных вагонах перавозіць праз сваю тэрыторыю з Швайцарыі ў Расею камуністычных павадыроў на чале з Леніным. Гэта было пасьля рэвалюцыі і зваленьня царызму ў 1917 годзе. Пры помачы камуністаў нямецкія палітыкі задумалі разлажыць расейскае войска і гэткім парадкам скасаваць усходні фронт.

Гэта ім поўнасьцю ўдаецца. Расейскае войска, на кінуты камуністамі кліч: „далоў вайну, мір без анэксыі і кантрыбуцыі!“ — кідае фронт і разыходзіцца дамоў. На месца даўнейшага войска камуністы твораць сваю „красную“ армію. Надыходзяць міравыя перагаворы ў Берасьці. У гэтым 1918 г. немцы падпісваюць мір з Украінай, якой аддаюць на поўначы нават некаторыя паветы беларускія, а проціў камуністаў, якія ў Берасьці не хацелі прызнаць нямецкіх варункаў, ськіравалі свае войска, якое ў скорым часе займае ўсю Украіну ды вялікую частку Беларусі аж па Днепр і Сож. Цяпер ужо выглядала, што Нямеччына йдзе да разьбіцьця „единой и недѣлимой“ на аддзельныя дзяржавы, якія маюць быць збудаваны паводле нацыянальнай адзнакі. Тагды і беларусаў акрыліла надзея, што немцы, калі хочуць быць консэквэнтнымі, мусяць стварыць і Беларусь. Як рэзультат гэтых надзеяў была тэлеграма менскіх беларусаў высланая Вільгэльму II-му, у каторай выражалася думка, што Беларусь толькі ў лучнасьці з Нямеччынай збудуе сваю незалежнасьць. Аднак на гэту тэлеграму ня было ніякага адказу. Відаць, нямецкая палітыка не хацела будаваць ніякай Беларусі і мела адносна яе іншыя пляны.

Але якія?

Гэта скора паказалася. Пасьля Берасьцейскага міру стала яўным, што Нямеччына ўступіла Украіне землі аж пад самы Бельск (каля Беластоку), а граніца Літвы мела праходзіць недзе каля Саколкі, значыць паміж Саколкай і Бельскам немцы пакідалі пустое месца. Каму-ж і нашто гэтае месца было празначана? **Яно было празнана на карыдор паміж Расеяй і Нямеччынай.** Па гэтым карыдоры ад Граева ў Баранавічы праходзіць чыгунка і гэтая чыгунка мела быць артэрыяй, злучаючай абодва краі. Гэтакім парадкам коштам Беларусі немцы мелі-б беспасрэдную граніцу з Расеяй і гэтым самым абміналі-б усе транзыты праз чужыя дзяржавы. Абярнуць Беларусь у нямецка-расейскі карыдор было для немцаў даволі лёгка, бо беларусы тагды толькі пачыналі тварыць нейкую палітычную сілу і вялікага значэньня ў палітычным жыцьці ня мелі.

Гэтакі пагляд немцаў на Беларусь, як на карыдор, трываў аж па сяньняшні дзень. Сяньня мы бачым нейкі пералом, які сьведчыць, што новая нямецкая палітыка выступае проціў „единой недѣлимой“: стаіць за падзел яе на нацыянальныя дзяржавы. Пачатак гэтай палітыцы даў Гітлер.

Украінская газэта „Час“ з 12.I. с. г. зьмясьціла вельмі цікавую гутарку свайго карэспандэнта з кіраўніком усходняга аддзелу гітлероўскай партыі Карлям Мотцам. Карль Мотц на пытаньне, як партыя адносіцца да вызвольнага руху народаў Усходняй Эўропы, або йнакш кажучы б. Расеі, заявіў: **„мы з аднаго боку прызнаём кожнаму народу Расеі права да самаазначэньня, з другога боку — нац — сацыялізм уважае, што існаваньне вялікай Расейскай дзяржавы ня ёсьць у інтарэсе Нямеччыны.** Расея ёсьць як памаранец: трэба толькі зьняць лупіну і яна распадзецца на свае складовыя часткі. Для нас гэтымі часткамі ёсьць **нацыянальныя дзяржавы ад Фінляндыі праз Украіну аж за Каўказ і сярэднюю Азію.“**

— А як вы адносіцеся да бальшавікоў?

— „Народныя сацыялісты маюць на мэце рашучае змаганьне з камуністамі Нямеччыны, але мыляўся-б той, хто-б думаў, што нар. сацыялізм носіцца з плянамі зьнішчыць камунізм на землях чыста расейскіх. Зьнішчэньне камунізму азначала-б узнаўленьне сільнай расейскай дзяржавы, а царская Расея, у пракананьні нар. сацыялістаў, ёсьць болей небясьпечная, як савецкая. Ня думаем ніколі мяшацца ў справы нутранага строю падзеленай Расеі.“

— З гэтага відаць, што Вы адкідаеце ўсе пляны тварэньня новых карыдораў?

— „Так, гэтакія пляны мы рашуча адкідаем“.

Гэтак прадстаўляецца гутарка карэспандэнта „Часу“ з п. Мотцам у справе для нас вельмі важнай. Падалі мы тут толькі важнейшыя думкі п. Мотца адносна ўсходняй палітыкі Нямеччыны, прапускаючы ўсё тое, што нас меней цікавіць. Як бачым, партыя Гітлера паддае, ці ўжо нават паддала рэвізіі дагэтуляшнюю палітыку Нямеччыны адносна Расеі і наагул усходу. Насьледкі гэтай зьмены нямецкай палітыкі могуць быць вялікімі і для Беларусі, пры гэтым аднак трэба адзначыць, што тагды толькі Беларусь будзе прадстаўляць для Нямеччыны нейкую рэальную вартасьць, калі яна будзе мець пэўную маральную сілу. А маральная сіла мерыцца паводле народнага ўсьведамленьня і народнай волі жыць самабытным жыцьцём.

Шкодная для беларусаў дзейнасьць камісіі „Pro Russia“

Мы ўжо няраз пісалі ў „Б. Крыніцы“ аб камісіі „Pro Russia.“ Зварочвалі мы ўвагу на яе палітычны назоў і на палітычныя тэндэнцыі, падмацаваныя ватыканскай палітыкай, далучэньня нашых зямель да Расеі. Пісалі аб усей крыўдзе і несправядлівасьці такога далучэньня пасьвячанага найвышэйшым рэлігійным і маральным аўторытэтам, успаміналі аб непрактычнасьці такой пастаноўкі справы, якая ня толькі крыўдзіць, але і дражніць нацыянальныя пачуцьці, як беларусаў так і ўкраінцаў. Вылічаючы ўсе гэтыя факты мы былі праканаваны, што камісія „Pro Russia“ робіць усё гэта нясьведама, не ар'ентуючыся ў нашых тутака адносінах і ў нашым палажэньні.

Але апошнімі часамі маем факты, якія прымушаюць нас зрэвідаваць нашыя пагляды на нястачу сьведамасьці і ар'ентацыі ў палітыкаў камісіі „Pro Russia“; болей таго: мы цяпер праканаваны, што ўсё робіцца на нашых землях ня **толькі сьведама але сыстэматычна, з добра абдуманым плянам.**

Вось факты:

Пару гадоў таму з беларускага кляштару ў Друі быў высланы ў далёкі Харбін ведамы і заслужаны беларускі духоўны а. д-р Ф. Абрантовіч, які мог-бы быць вельмі карысны тут у нас на бацькаўшчыне. Высылка адбылася даволі проста і разам з гэтым спрытна „парадзілі“ яму прыняць усходні абрад, навучыцца правіць царкоўную службу ў гэтым абрадзе, запусьціць бараду і вусы — і калі ўсё было гатова, выслалі яго з роднага краю „на місіі“ так далёка, каб і вярнуцца было трудна... А ў наш край, дзе місыйнае поле (гледзячы з пункту саpraўды каталіцкага) дужа вялікае, прысылаюць палякоў, французаў, бэльгійцаў і маюць прыслаць нават галяндцаў...

Ці-ж гэта не палітыка? То-ж гэтак-сама робяць і польскія біскупы ў нашым краі: арцыб. Ялбжыкоўскі ўжо даўно павысылаў беларускіх ксяндзоў з беларускіх парафіяў, а біскуп Лазінскі ў Пінскай дыэцэзіі таксама дзяржыцца падобнай тактыкі.

Другі факт: апошнім часам даведаліся мы, што з Друі маюць выслаць другога выдатнага беларускага ксяндза Я. Гэрмановіча і таксама аж у Харбін. Загад аб высылцы кс. Я. Гэрмановіча выдала тая-ж камісія „Pro Russia.“

Трэці факт: айца А. Дуброўскага з Альбэртына, значыць з беларускай тэрыторыі, выслалі ў Дубна на ўкраінскую тэрыторыю. Праўда, выслалі яго на рэктара ўніяцкай сэмінарыі, значыць далі павышэньне, але мусіць дзеля таго і павысілі, каб адарваць ад роднай зямлі, так як і кс. Абрантовіча. Як Альбэртын, так і Дубна знаходзяцца пад загадам тэй-жа камісіі „Pro Russia.“

Вось маем тры факты, якія сьведчаць аб экстэрмінацыйнай палітыцы беларускага элемэнту на беларускіх землях праводжанай рымскай камісіяй „Pro Russia.“ Гледзячы на такую палітычную работу рымскай камісіі, што ж маюць рабіць нашыя іерархі? Ясна, што стараюцца праводзіць такую самую, ды яшчэ і глыбейшую палітыку. Аб усіх крыўдах, якія цэрпяць ад іх беларускае духавенства і беларускі народ мы ўжо няраз пісалі. Цяпер маем новы факт: нядаўна ў Львове быў пасьвячаны на духоўніка ўсходняга абраду а. Туровак, беларус, які кончыў духоўныя студыі ў Львове. Прыяжджаў ён у Вільню і Пінск, просячы духоўныя ўлады, каб яго прынялі ў свае дыэцэзіі; аднак іерархі гэтых дыэцэзіяў катэгарычна адмовілі, дык прышлося айцу Туроўку астацца вікарым на Ўсходняй Галіччыне. На роднай зямлі для яго месца не знайшлося!

А гэта ці не палітыка? Ці тут ня ўзялі прыклад згары, ад камісіі „Pro Russia“? Калі ёй вольна высылаць беларускіх духоўных з краю, то „вольна“ нашым каталіцкім іерархам іх ня пусьціць у край.

Вось трагедыя беларускага духавенства і беларускага народу! Ня дарма некаторыя ўцяклі заграніцу, а адзін аж на той сьвет...

Трудна жыць у такіх варунках. Але беларускае каталіцкае духавенства не павінна падаць духам, не павінна падавацца гнятучай дэпрэсіі; дасьць Бог пераживем і гэта ліха. Толькі трэба пратэставаць проціў тых зьдзекаў, якія да яго тасуюцца камісіяй „Pro Russia," або тутэйшымі іерархамі, трэба не маўчаць, але перад усім сьветам выказваць усе крыўды.

Да ўсяго гэтага трэба дабавіць і тое, што а. Абрантовіч і а. Гэрмановіч належаць да законнага ордэну А.А. Марыянаў, якіх мэтай ёсьць працаваць прадусім пасярод свайго народу (гл. кніжку „Рэлігійнае жыцьцё на Беларусі," Вільня 1932 стар. 62); а што з імі зрабіла камісія „Pro Russia"? Ці ведае аб гэтым галава ордэну біскуп Бучыс? А калі ведае, то нашто пазваляе праводзіць палітыку ў сваім ордэне?

Усё гэта сьведчыць аб шкоднай рабоце камісіі „Pro Russia" на беларускіх землях. „Дзейнасьць" гэтай камісіі беларускі народ будзе доўга помніць.

Каталік.

З газэт.

Пагляды Гітлера аб расейцах і Расеі.

„Сегодня" зьмяшчае стацьцю ведамага расейскага пісьменьніка Алданова, які аб Гітлеры так піша: „Гітлер ненавідзіць жыдоў, сацыялістаў і Францыю — гэта тры галоўныя прадметы ягонай лютай ненавісьці. Але ёсьць яшчэ і шмат іншых прадметаў — гэткі запас злосьці можна знайсьці хіба толькі ў бальшавікоў. Ненавідзіць Гітлер і Расею — лепш кажучы — ён лічыць расейскі народ за ніжэйшую расу, асуджаную на гібель. Расея, у пракананьні павадыра нацыянал-сацыялістаў, цалком збудавана немцамі. Арганізацыя расейскага дзяржаўнага будынку — піша ён — ня была рэзультатам дзяржаўна-палітычнага творства славянскага элемэнту ў Расеі. Яна (гэта арганізацыя) зьяўляецца скарэй за ўсё нязвычайным прыкладам дзяржаўна-творчай работы германскага элемэнту над ніжэйшай расаю... Ніжэй стоячыя народы, маючы немцаў за павадыроў і арганізатараў, часам будавалі магутныя дзяржаўныя творы. Цяпер нямецкі элемэнт у Расеі вырваны з карэньнем і затым Расея мусіць згінуць: канец жыдоўскага панаваньня ў Расеі будзе канцом і расейскай дзяржавы.

Гэтакія пагляды Гітлера на расейцаў і Расею. Хоць дзіка, але арыгінальна. Алданаў называе іх балтоўнёю малаграматнага чалавека. А нам здаецца, што Гітлер шчыра і адкрыта сказаў тое, што большасьць Немцаў сапраўды думае. Гэткія пагляды Гітлера паясьняюць нам ягоную палітыку адносна Расеі, аб чым пішацца ў перадавіцы нашай газэты.

р.

З беларускага жыцьця.

Шаўлянская бел. школа мелася ладзіць на 26.XII.31 г. школьнае прадстаўленьне, але Браслаўскі стараста ня даў дазволу, матывуючы тым, што на папярэднім прадстаўленьні былі нейкія праступкі (пшэкрочэня). Кіраўнічка Шаўлянскай школы падала рэкурс да Ваяводы.

Нам здаецца, што караць адмаўляньнем дазволу на новыя прадстаўленьні ёсьць ня толькі несправядлівым, але непэдагогічным. Найлепш гэту несправядлівасьць адчуюць дзеці. Спадзяёмся, што п. ваявода, па сабраньні об'ектыўных даных, гэту забарону Браслаўскага Старасты адменіць.

Падаючы гэту вестку, разам з гэтым адзначым, што ў Шаўлянскую школу, ня гледзячы на познае зацьверджаньне Куратарыяй вучыцелькі грам. Булызіхі, запісалася 46 дзяцей. Заняткі пачаліся перад Калядамі.

Новы Гурток БІГіК залажыўся ў в. Шальціны Браслаўскага пав. У часовы ўрад гуртка вызначаны Цэнтраляй такія асобы: Алена Аніська — старшыня, К. Урбановіч — скарбнік і Ант. Мароз — сэкратар.

Лекцыі ў Будславе і Сьвірыдавічах мае прачытаць інж. Клімовіч: У Сьвірыдавічах — 30.I. а гадз. 18 мін. 30, а ў Будславе 31.I. с. г.

Пасольская інтэрпэляцыя. Дня 12 г. м. пасол Ф. Ярэміч падаў у Сойме ў Раду Міністраў інтэрпэляцыю ў справе надужыцьцяў падчас агульнай перапісі насельніцтва на беларускіх землях.

Гурток БІГіК у Іказьні, Браслаўскага пав. ажывіў сваю дзейнасьць. Дня 1-га г. м. гурток Інстытуту зладзіў беларускае прадстаўленьне, якім зацікавіў ваколічнае насельніцтва і мае такія і падобныя імпрэзы ладзіць далей.

„Бесы" ў царкоўнай званіцы. Апошнімі часамі пачала ў Вільні выходзіць „праваслаўная" часопісь „Голас Праваслаўнага Беларуса". Гэтымі днямі вышаў № 2 гэтай часопісі, зьмест якога зусім адпавядае загалоўку гэтай нашай зацемкі. Такога „хрысьціянскага" тону ў змаганьні з сваімі ідэолёгічнымі праціўнікамі хрысьціянскі сьвет мусіць яшчэ ня чуў. Але да ацэны гэтых „хрысьціянскіх" вывадаў „Голасу Праваслаўнага Беларуса" яшчэ вернемся другім разам.

Судовая справа б. пасла Б. Тарашкевіча. Віленскія газэты падаюць, што судовае сьледзтва Б. Тарашкевіча, які сядзіць у турме ў Горадні, ужо закончана і перададзена ў Віленскі акружны суд.

З Камісіі Стыпэндыяльнага Фонду Б. Н. К. паведамляюць, што ўсякія стараньні аб пазычкі ня могуць быць прыняты пад увагу, бо сам „Стып. Фонд", паводле абавязуючага рэгуляміну, ня ёсьць інстытуцыяй пазычковай.

У справах-жа атрыманьня стыпэндыі трэба зьвяртацца ў „Студ. Саюз", бо Камісія Стып. Фонду, паводле тагосамага рэгуляміну, беспасярэдна ніякай дапамаговай акцыі не вядзе.

„Шлях Моладзі" і гражданкай і лацінкай. 17.I. г.г. адбылося ў кватэры БІГіК. сабраньне рэдакцыйнай калегіі „Шляху Моладзі" і некаторых супрацоўнікаў і сымпатыкаў. З адказаў на анкету, праведзеную ў прошлым годзе, аказалася, што выключна за гражданку высказаліся ў 8 адказах, выключна за лацінку — у 7, а за мяшаны спосаб друкаваньня, г. зн. і гражданкай і лацінкай — у 14 адказах. Апроч гэтага быў адзін адказ, які радзіў друкаваць адзін нумар гражданкай, другі лацінкай. Апіраючыся на большасьць галасоў, а так-жа маючы на воку еднасьць беларускага народу, які павінен знаць у сяньняшніх абставінах абодва шрыфты, сабраньне пастанавіла ўсімі галасамі проціў аднаго друкаваць „Шлях Моладзі" ад студзеня сёл. году і гражданкай і лацінкай. Пры гэтым лацінскі шрыфт будзе ўжывацца цалком зрэформаваны, г. зн. апроч „č" і „š", будзе ўведзена вузкое „v" замест польскага шырокага „w".

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Бюджэт БССР на 1932 г. Камісар фінансаў БССР. А. Хацкевіч падае у „Сав. Бел". (№ 286-1931.) праект бюджэту на 1932 год. Паводле гэтага праекту агульны расход выносіць 857 мільёнаў рублёў. Даход, бее агульна-саюзнай датацыі, 587 мільёнаў рублёў, дэфіцыт 270 міл. руб. пакрывае ўвесь СССР. Такім чынам на галаву ў БССР прыпадае падаткаў блізу 120 рублёў (5 мільёнаў насельніцтва, падаткаў 587 мільёнаў). Нам здаецца, што Хацкевіч падаў дутыя лічбы, бо такіх высокіх падаткаў насельніцтва плаціць ня можа. Урэшце мы ня знаем добра цяперашніх падаткаў у БССР: магчыма, што пры калгаснай і наагул камуністычнай сыстэме можна спагнаць і 120 рублёў з душы! Добра было-б, каб А. Хацкевіч гэту справу выясьніў у менскай прэсе, бо такая высокая лічба падаткаў выглядае мала праўдападобнай.

„А хто там ідзе"? — гэты папулярны народна-беларускі гымн Янкі Купалы прызнаны нейкім У. Гітгарцам у „Зьвязьдзе" (8.XII.31.) клясава-варожым і чуць не контррэвалюцыйным, а гэта затым, што там, пасьля пытаньня „А хто там ідзе ў вагромністай такой грамадзе?"—стаіць адказ не „рабочыя", не „пралетары", а „Беларусы". А гэта ўжо пахне „нацыянал-дэмакратызмам".

З збожжазагатоўкамі дрэнна. „Сав. Б." з 13.XII.31 г. паведамляе, што „сучасныя тэмпы збожжазагатоўчай кампаніі ў БССР яўна нездавальняючыя. Яны не забясьпечваюць гадавога пляну збожжазагатовак да 1 студзеня 1932 г. На 5 сьнежня м.г. гадавы збожжазагатоўчы плян выкананы па рэспубліцы на 63,6 проц. Да раёнаў, якія ганебна адстаюць у збожжазагатоўках, трэба аднесьці: Койданаўскі, Мазырскі, Рэчыцкі, Брагінскі, Лельчыцкі, Слуцкі, у якіх выкананьне гадавога збожжазагатоўчага пляну не перавышае 45 проц. Асабліва трэба падкрэсьліць

Ад. Клімовіч:

3)

І культура і палітыка.

(Рэфэрат прачытаны на Зьезьдзе БХД 13.XII.1931 году).

V.

Гэтак мінуў век 16, 17, 18 і добрая палова 19-га.

Падуў урэшце сьвежы вецер. Жывы дух беларускай зямлі Кастусь Каліноўскі (Jaśka — haspadar z-pad Wilni) ў 60-тых гадох м. ст. ўскалыхнуў заспаным нашым народным сумленьнем. Выпадкі хутка зьмяняліся. Каліноўскага зьмянілі народнікі (1880—1905 г.) і нашаніўцы. Прагрымела першая і другая расейская рэвалюцыя, 14 сьнежня 1917 г. сабраўся ў Менску Усебеларускі Кангрэс, каторы пасьпеў аднак толькі выбраць выканаўчы свой орган — Раду Кангрэсу, якая ўноч з 24 на 25 сакавіка (марца) 1918 г. абвесьціла ўсяму сьвету жаданьне Беларускага народу быць вольным і незалежным.

Гэта быў найвышэйшы пад'ём нашага народнага палітычна-адраджэнскага жыцьця і ад гэтага мамэнту дальшыя падзеі малеюць. Хапіла народнай энэргіі, каб выказаць сваю волю, але не хапіла сіл гэту волю падтрымаць. Не вялікімі аказаліся запасы сілаў культурных, але бадай яшчэ меншай — палітычная сьпеласьць, якая абымае ў сабе і навуку і мастацтва.

„Ня вучачыся — кажуць — і лапця не сплянцеш", — а дзе-ж, калі і як меў навучыцца палітыкі вякамі няволены да таго часу сярмяжны Беларускі народ? Ня дзіва дзеля гэтага, што абвешчаная ў свой час незалежнасьць Беларусі ня была ўтрымана.

VI.

Сягоньня мы гэнага мамэнту мусім ня толькі шкадаваць, але з яго і вучыцца. Да ўтрыманьня Незалежнасьці прад 14-цю гадамі нам не хапала і сваей культуры і сваей нацыянальнай палітыкі. У галіне культуры за гэты час 14-цёх гадоў ня мала зроблена; але як-жа мала зроблена і як мала робіцца ў галіне беларускай *нацыянальнай палітыкі!* З другога ўзноў боку, колькі і якіх памылак у гэтым кірунку не рабілася рознымі безадказнымі асобамі?! Гэта змушае нас затрымацца тут над пытаньнем, чым павінна кіравацца палітыка наагул, а сучасная беларуская палітыка асабліва?

„Усякі свайго шчасьця каваль" — і правамэтнасьць палітычнай дзейнасьці, як адзінкі, так і грамадзянства, можна вытлумачыць толькі тым, што чалавек з вольнай сваей ініцыятывы, з вольнай волі можа ўплываць на ўклад і на направу публічнага жыцьця. Калі чалавеку кепска жывецца, дык ад яго залежыць, каб было лепей. На тое-ж чалавек абдараваны вольнай воляй. Калі гэтага ня ў сілах зразумець кожны сам, хай парадзіцца з разумнейшым суседам...

VII.

Але для шукаючага духа не канец і на гэтым, бо існуе-ж сяньня гэтулькі пaглядаў на грамадзка-палітычны лад, што сапраўды цяжка там не заблудзіцца.

Жывём сягоньня ў часе хаосу паняцьцяў, дзівачных парадоксаў і каркаломных экспэрымэнтаў: у 18-цёх толькі дзяржавах — 16 мільёнаў галодных безработных, а амэрыканскія багачы высыпаюць у мора сваё збожжа, каб толькі захаваць добрую на яго для сябе цану; Ліга (дзяржаўных) народаў радзіцца бязупынна аб разаружэньні, ладзіць лебядзіны канцэрт „вечнага міру," а вайна народаў — крывавая і някрывавая (гандлёвая) — ані на хвіліну ня прыпыняецца; гаворыцца аб палепшаньні быту і санітарных умоваў жыцьця найслабейшай клясы насельніцтва — работнікаў і батракоў, а ня відзіцца, як гібеюць яны ў норах, быццам немае бязвольнае стварэньне. (*д. б.*)

недапушчальнае адставаньне саўгаснай сыстэмы. Па саўгасах (бальшавіцкіх казённых дварох) БССР гадавы плян выкананы ўсяго толькі на 42 проц.

Таксама нездавальняюча стаіць справа збожжазагатовак у калгасным сэктары. Там, напр. у Смалявіцкім раёне, дзе агульны плян па раёне выкананы на 52 проц., то калгасны сектар раёну даў толькі 27 проц. свайго пляну. У Веткаўскім раёне мы адпаведна маем 54 і 23 проц. Ёсьць калгасы, якія не здалініводнага цэнтнара збожжа. А ў некаторых калгасах у Вушацкім і Гарадоцкім гадавы плян перавыкананы.

Аднаасобныя серадняцкія гаспадаркі выканалі свой плян блізу на 60 проц., а кулацкія—на 31 проц.

З праваслаўнага жыцьця.

Епархіяльны зьезд. 1—2 лютага будзе адбывацца ў Вільні епархіяльны зьезд праваслаўнага духавенства. На зьезд запрошаны асобы не паводле выбараў, а паводле „ўгоднасьці“ сваей уладзе. Дзеля гэтага на зьезьдзе ня зможа выявіцца незалежная думка і свабодная слова крытыкі.

Уступныя нарады ў справе склікаНьня сусьветнага сабору прав. царквы маюць адбыцца на гары Афоне 19.VI. с. г. Кожная аўтокефальная царква пасылае па 2 дэлегаты. Ад правасл. царквы ў Польшчы дэлегаты будуць выбраны на бліжэйшай сэсіі Сыноду.

Унійныя нарады ў Рыме і польска-расейскі саюз на нашых землях.

З украінскіх кругоў паведамляюць, што эпіскап Чарнэцкі цяпер прабывае ў Рыме, дзе адбываюцца важныя нарады ў справе уніі на ўкраінска-беларускіх землях і што мае быць рэарганізавана камісія „Pro Russia.“

На наш пагляд ніякай рэарганізацыі спадзявацца ня трэба, бо там заселі расейскія нацыяналісты, як а. Валконскі і Дэйбнэр, якія кіруюць усім.

Словам, як польскія духоўныя ўлады высылаюць ксяндзоў беларусаў з беларускіх парафіяў, так расейцы з рымскай камісіі высылаюць беларускіх духоўнікаў з беларускай тэрыторыі як можна далей ад беларускага народу. — Хто-б мог спадзявацца, што будуць яны саюзьнікамі ў гэтай справе?

к.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Не забывайцеся аб сваіх студэнтах беларусах!

Складайце ахвяры на «Стыпэндыяльны Фонд»!

Камунікат

Цэнтральнага Ураду Б. Інстытуту Г. і К. да ўсіх гурткоў.

Цэнтральны Урад Б.І.Г. і К. прыпамінае ўрадам гурткоў, што паводле § 4 рэгуляміну гурткі павінны прысылаць справаздачу з сваей дзейнасьці за 1931 год.

Справаздача павінна быць кароткая. Трэба падаць: 1) колькі адбылося паседжаньняў ураду гуртка, 2) што гурток зрабіў за мінулы год (колькі наладзіў вечарын, спэктакляў, лекцыяў, як разьвівалася бібліятэка-чытальня, колькі прыдбана новых кніжак, колькі ёсьць усяго кніжак у бібліятэцы ці пашырылася беларускае друкаванае слова і гэтак далей трэба апісаць усю працу гуртка), 3) які плян працы мае гурток на будучы год, 4) падаць суму прыходаў у касе, суму расходаў і сальдо (г. зн. рожніцу паміж прыходам і расходам), 5) колькі гурток мае сяброў, 6) які склад ураду гуртка (хто старшыня, скарбнік і сэкрэтар і іх адрасы), 7) адрэс кватэры гуртка, 8) хто загадчык бібліятэкі гуртка на 1932 г.

Справаздачу трэба прысылаць да 1-га сакавіка г. г. Гурток, які да гэтага часу не прышле справаздачы, будзе лічыцца бязьдзейным. Пры справаздачы можна выразіць Цэнтралі свае пажаданьні адносна прысылкі кніжак, газэт і г. д.

Цэнтральны Урад
Б. Інстытуту Г. і К.

З украінскага жыцьця.

Цікавая дэклярацыя польскага ўраду ў справе ўкраінскай адбылася ў суботу 16 студзеня на бюджэтнай камісіі сойму. Міністар Унутр. Спраў Перацкі заявіў тое, што заяўлялі перад ім бадай усе міністры, а іменна: што польскі ўрад заўсёды імкнецца да таго, каб усе грамадзяне Польшчы мелі роўныя правы, што ўрад ня спыняе дзейнасьці ўкраінскіх гаспадарчых арганізацыяў, што гатоў памагчы нават укр. спартовым арганізацыям пад тым варункам, што яны ня будуць мяшацца ў палітыку і выступаць проціў Польшчы і д. д.

На гэтае ўкраінскія прадстаўнікі адказалі, што ўкраінскае грамадзянства на гэтульні разьбіраецца ў сучасных рэальных адносінах, што ўзяць яго на стройныя словы нельга.

З Польшчы.

Прапазыцыя недаверу цяперашняму польскаму ўраду ўнесена ў Сойм апазыцыйнымі польскімі партыямі (эндэцыя і „цэнтралеў“). Прапазыцыя гэта ўнесена з прычыны суду над б. берасьцейскамі вязьнямі і выкрытых на судзе абставін. Прапазыцыя мае характар болей дэманстрацыйны, чым рэальны, бо яна напэўна будзе адкінута большасьцяй Б.Б.

Рэзультаты агульнага сьпісу ўжо паакрысе публікуюцца. У Польшчы аказалася 31 мільён 927 тыс. душ. Рэзультаты сьпісу будзем падаваць у наступных нумарох нашай газэты.

З заграніцы.

Японія бярэ Харбін. Пасьля заняцьця паўднёвай Манджурыі аж да вялікай кітайскай сьцяны, японцы сьціраваліся на поўнач. Горад Ціцікар ужо даўно ў іх руках, цяпер прышоў чарод на Харбін. Японскія аэрапляны ўжо абстралялі ваколіцы гэтага гораду, а гэта знак, што японцы прыбліжаюцца. Галоўнакамандуючы япон. арміяй у Манджурыі ген. Хонё заявіў, што наступ Японіі яшчэ ня скончыўся. — Ёсьць чуткі што пасьля заняцьця паўночнай Манджурыі, японцы сьцірующца на захад — у Манголію.

Пляны Японіі. Апошнім часам камуністычны Інтэрнацыянал апублікаваў цікавы мэморыял б. японскага прэм'ера Танакі. Гэты мэмор'ял падаены быў яшчэ ў 1927 г. японскаму Мікаду і датычыць плянаў Японіі ў Азіі. Паводле гэтых плянаў Японія мае забраць ня толькі Манджурыю, але ўвесь Кітай, Манголію, Філіпіны, Маляйскія выспы і бадай усю Азію. Але перад тым трэба будзе прыгвазьдзіць Злуч. Штаты Паўноч. Амэрыкі, якія не дапусьцяць да такога пашырэньня японскіх уплываў, так як у 1904—5 гадох была прыгвожджана Расея.

Калі гэты мэмор'ял праўдзівы, то сапраўды Японія мае вялікі апэтыт. Дзівіцца трэба, што гэты народ, які лічыць толькі 70 мільёнаў, ідзе вайной проціў Кітаю, які лічыць 400 мільёнаў, гатоў іьсці проціў Саветаў, якія маюць 160 мільёнаў і проціў Злуч. Шт. Амэрыкі, маючых 120 мільёнаў. Відаць, што Японія ня так верыць у людзкія масы, як у тэхніку сучаснага ўзбраеньня, у сусьветны гаспадарчы крызыс і ў далёкасьць тых дзяржаў, якія хацелі-б перашкодзіць у яе плянах.

Як ваюе Японія ў Манджурыі. Карэспандэнты заграмічных газэт апісваюць способы цяперашняй вайны ў Манджурыі. Пры вялікіх абшарах гэтага краю японцы найбольш ужываюць аэрапляНаў, для каторых соткі кілямэтраў нічога не значаць. Найперш японцы высылаюць лёгкія аэрапляны на разьведку, якія з вялікай вышыні аглядаюць усю мясцовасьць, зварочваючы пры гэтым найпільнейшую ўвагу на мясцы пастою кітайскага войска і на яго рухі. Потым высылаюць спэцыяльныя аэрапляны з бомбамі (бомбісты), якія закідаюць бомбамі назначаныя японскім штабам мясцы. Разам з імі лятуць цяжкія (браніраваныя) аэрапляны з кулямётамі, якія ачышчаюць мясцовасьць ад

W. A. 3)

Kaniok-Harbuniok.

VI.

Świtać tolki pačało,
Lacić Janka u siało;
Dy tak bieh chutčej, skarej!
Papałochaŭ ŭsich kurej.
Śpiašyŭ-piorsia tak biaz miery,
Što zhubiŭ u chacie dźwiery —
(Duraku usio adno!) —
Staŭ jon leźci praz akno.
„Hej, piačurniki, nia śpicie,
Bardžej chatu adčynicie!
Čarta bačyŭ ja, a-jej!
Adčynicie mnie skarej!“
Braty dźwiery adčynili,
Durnia ŭ chatu upuścili;
Pačali jaho ruhać,
Što chacieŭ ich napužać.
Wot Iwan z wačej im sčez:
Ŭ try mihi na pieč zalez.
Loh, ziawaje, piaje pieśni,
Raskryčaŭsia, čuć nia treśnie.
Pośle kaža: „Tak i tak...
Widzieŭ čorta ja adnak:
Čorny, strašny, krywy rohi,
Z kapytami jaho nohi,
Jašče wielmi doŭhi chwost —
Na uwieś čartowy rost.
Bje pšenicu kapytami,
Reža wostrymi zubami,
Zamiataje ŭsio chwastom.
Ja-ž siadzieŭ tam za kustom.
Razyhrałaś maja kroŭ:
Ja taksama tut zaroŭ;
Jak za chwost jaho chwaciŭ,
Dyk trymaŭ i nia puściŭ.
Pa chwaście, jak pa drabinie
Skočyŭ, sieŭ jamu na śpinie;
Daŭ u bok jamu kalenam,
Zaśmiardzieŭ jon horkim chrenam.
Nios mianie jon, nios i nios —
Wyšej chmaraŭ, da niabios;
Dy tak zmohsia na chadu,
Što jazyk na baradu
Jamu wypierła. Až prosić:
„Bratok, Janka, dosyć, dosyć!
Puści — ŭ piekła užo čas;
Dajuć pieŭni znak jakraz.
Nia hubi mianie sa świetu.
Cełу hod tabie za heta
Abiacajusia służyć:
Prad carkwoj pakłony bić.
I nichto mianie nia zmusić —
Bolš ludziej, ci babaŭ kusić“.
„Ja i źlez z čarta dałoŭ,
Dyj puściŭ jaho damoŭ“.
Janka doŭha tut ziawaŭ,
Bolš ni słowa nie skazaŭ.
„Ech, bałwan ty, durań ty!“
Tak kazali dwa braty.
Rahatali ŭ kułaki
I chwatali za baki...
Jašče doŭha pośle toha
Chachatali, jak z durnoha.
Sam stary nia moh strymacca,
Kab da śloz nie raźśmiajacca.
Tut biada jaho datknuła —
Niešta ŭ bok jamu kalnuła.
A jak wielmi rasstahnaŭsia,
To ŭžo bolej nie śmiajaŭsia.
Bo starym, widać, nia možna
Chachatać nieaściarožna.

VII.

Latuć chmary, wiecier honić;
Drewa z drewam štoś hamonić.
Dzień za dniom śpiašaŭsia duža;
Ich Illa chwataŭ dasuža,
Tasawaŭ ich, tak jak karty;
Caniŭ, wažyŭ, čaho warty:
Choć i dobry, choć i złydni —
Pa siem dnioŭ składaŭ u tydni.
Pa čatyry tydni ŭziaŭšy,
Dni pa dwa, ci try dakłaŭšy,
Z całaj sumy rabiŭ miesiac.
Daŭ druhi, a pośle dziesiać —
Złažyŭ hod pa kalendaru.
A sam hlanuŭšy praz chmaru,
Zapisaŭ jaho, jak treba —
Iznoŭ chmaraj zakryŭ nieba.
Hod lacić tak za hadami;
I nia wiedajem my sami,
Što, adkul i jak bierecca?
Skul wada ciače u rečca?
Adkul heta wiecier wieje?
Chto na niebie zorki sieje?
Adkul chmary, skul małanka?
Nia znaŭ hetaha i Janka.
Kolki času, mała-mnoha,
U Illi prajšło światoha? —
Ja nia znaju — nia pytaŭsia!
Janka z piečaj raźwitaŭsia:
Chadziŭ niehdzie, rabiŭ niešta;
Mienš dureŭ, a bolej zrešta
Pracawaŭ, jak było treba,
Kab nia jeści darma chleba.
Braty mała uważali,
Jaho durniam časta zwali.
Čas kaciŭsia dalej-bolej
Z ciažkoj, horkaj ludzkoj dolaj.
Dy kamu jakoje dzieła,
Kolki času pralacieła?
Pamiž dniami wiečny taniec:
Bieskaniečny toj ražaniec,
Što Illa światy zawioŭ —
Z ludzkich śloz, biady, trudoŭ...
Dy što budziem biadawaci?
Och!... na wiek naš hora chwacie.
Dzień lacieŭ tak, noč za dniom...
Dalej baśniu pawiadziom! *(d. b.)*

кітайцаў, а за імі ўжо йдуць на „гатовае“ пяхота і коньніца, разам з танкамі, панцэрнымі аўтамабілямі і цягнікамі. Сапраўды цяжка з такой арміяй ваяваць! Тут ужо вае не чалавек, але машына.

Японскі гэнэрал Мінамі, бышы ваенны міністр, заявіў прадстаўніком прэсы, што кітайская армія дужа вялікая што да колькасьці, але вельмі слабая і проста нічога ня варта што да якасьці і што да тэхнічнага ўзбраеньня. Даволі японскай арміі дунуць на яе, каб яна разьляцелася як пух.

Японцы апошнім часам заводзяць свае парадкі ў Манджурыі, сваю адміністрацыю, свае ўстановы, свой гандаль — словам, так паступаюць, як-бы гэта быў ужо іх уласны край.

Лёзанская канфэрэнцыя ўсё-ж такі зьбіраецца 25 г. м. Усе нямецкія партыі дамагаюцца ад Брюнінга, каб ён і на Лёзанскай канфэрэнцыі сказаў тое, што быў сказаўшы англійскаму амбасадару: **што Нямеччына плаціць ваенных адшкадаваньняў ня будзе, бо ня можа.**

За скасаваньнем ваенных адшкадаваньняў выразілася Англія і Італія. Муссоліні заявіў, што якім спосабам можна вымагаць, каб народы плацілі адшкадаваньні ды яшчэ ў золаце, калі гэтага золата ніхто ня мае?... Такім парадкам за адшкадаваньні ўжо мусіць прыйшоў канец.

На скасаваньні адшкадаваньняў найгорш мусіць выйдзе Амэрыка, бо яна будзе прымушана дараваць даўгі Эўропе. А доўг не малы: каля 14 мільярдаў даляраў! Як падае француская газэта „Journal“, Францыя, Англія, Італія і Нямеччына маюць выступіць да ўраду Злуч. Штатаў П. Амэрыкі з нотай дамагаючыся скасаваньня даўгоў. Дагэтуль Амэрыка на такія дамаганьні адказвала, што не даруе ні граша. Што яна цяпер адкажа, — згадаць трудна. Але здаецца, пасьля таго, як яе зашахавала Японія, яна будзе болей уступчывай і калі ня ўсе даўгі даруе, то прынамся часьць. Але паглядзім, што будзе. Тымчасам Амэрыка сваіх прадстаўнікоў у Лёзанну не пасылае.

Адстаўка Брiана выклікала і адстаўку ўсяго францускага ўраду. Прэзыдэнт Францыі даручыў тварэньне новага габінэту даўнейшаму прэм'еру Лявалю. У новы габінэт увайшлі тыя самыя людзі што былі і ў даўнейшым, толькі на месца памёршага міністра вайск. спраў Мажыно ўвайшоў Тардеу. Сам Лявальь захаваў для сябе тэку міністра замежных спраў. Габінэт мае правы характар і, як кажуць, будзе прыдзержывацца курсу „сільнай рукі“ адносна Нямеччыны.

І ў Францыі безрабоцьце. Дзеля гаспадарчага крызісу, які апанаваў і Францыю, палажэньне работнікаў, якія выехалі туды шукаючы працы, стала крытычным. З аднаго боку паведамляюць, што францускі ўрад будзе бясплатна адстаўляць безработных на іх бацькаўшчыну, а з другога — што безработныя думаюць аж пехатой варочацца ў свой край. Калі францускі ўрад і мае намер да ліпня гэтага году бясплатна адвазіць безработных, то мусіць толькі да свае граніцы, а потым, праз усю Нямеччыну, нашым „французам“ трэба будзе сапраўды йсьці пехатою, калі не сабралі грошай на падарожу.

Арышт жонкі Гандi'я. Пасьля таго, як быў арыштаваны Гандi, была арыштавана і ягоная жонка, якую асудзілі на 6 тыдняў вастрогу. Цяпер арыштавалі і сына Гандi'я.

Пакты аб ненападаньні йдуць туга, асабліва з Румыніяй. Румынія зажадала ад Саветаў, каб яны прызналі цяперашнія румынскія граніцы, інакш кажучы, каб прызналі за Румыніяй Бэсарабію. Саветы такі варунак адкінулі, паклікаючыся на тое, што яны ніякай дзяржаве не гварантуюць граніц. На гэтым пункце перагаворы паміж Румыніяй і СССР, якія вядуцца ў Рызе, замерзьлі.

Польшч ізноў паставіла такі варунак, што яна падпіша пакт аб ненападаньні з СССР толькі тады, калі будзе ведамы час падпісаньня гэтага пакту Латвіяй і Эстоніяй. Дык Саветы цяпер намагаюць на тое, каб чым-скарэй падпісаць пакты з Латвіяй і Эстоніяй і каб гэтакім парадкам прымусіць падпісаць і Польшч.

Zhublenyja dakumenty Mikałaja Šyły: wajskowaja knižačka, wydanaja Wilenskim P.K.U.; zaświadczenie Bakštanskaj hminy Wałožynskeha paw., pratakoł świardžajučy abywatelstwa, zaświadczenie Biełaruskaj Wuč. Seminaryi ŭ Barunach i inš. uniewažniajucca.

Да нас пішуць.

ЖУДАСНАЕ ПАЛАЖЭНЬНЕ ВЁСКІ.

Юрацішкі, Валожынскага пав. Газэты пішуць, што сяляне ўцякаюць у Расею, а ўцёкшыя адтуль расказваюць аб жудасным жыцьці сялян і ў Расеі. Праўда, блага жывецца беларускаму селяніну пад бальшавікамі, але не здабра наш селянін і ўцякае ад сваей гаспадаркі і сям'і да бальшавікоў. Цяперашняе жыцьцё нашага селяніна проста жудаснае. Ураджай мінулага лета быў слабы. Скаціна ідзе забясцэн, заработкаў нідзе ніякіх. У краме тавары дарага, падаткі не паменшыліся, паліцыя пратаколаў пісаць за „ппэкрочэне адміністрацыйных пшэпісаў“ не перастае, у старостве паводле гэтых пратаколаў назначаюць штрафы не шкадуючы. У лепшыя часы сяляне апазычыліся ў розных гмінных касах Стэфчыка, а цяпер трэба аддаваць доўг, калі на пакрыцьцё гэтага доўгу не хапае і ўсяе гаспадаркі селяніна. Дык нічога і дзіўнага, што селянін выракаецца ўсяго і йдзе, куды вочы вядуць і ногі нясуць. Калі так далей патрывае, сяляне будуць выракацца гаспадарак і пойдуць у сьвет, каб ня бачыць і ня чуць тае жудасьці, якая ўжо залезла ў беларускую вёску.

Тутэйшы.

АБ „СТОВАЖЫШЭНЬНІ,“ ПАНУ ЯВОРСКІМ ДЫ „ПАЛІТЫЧНА..“ ЛЯВОНІСЕ.

в. Сьвінка, Вялейскага пав. Усе ўжо здаецца ведаюць, што такое СМП і ўсе знаюць, што арганізаваньнем гэтых „stowažyšeńniaŭ“ займаюцца ксяндзы — палякі. Тое самае і ў нас. Некалькі тыдняў таму прыехаў у нашую вёску ксёндз, сабраў маладзяж і давай „арганізаваць“... Маладыя, як пачулі аб што ходзіць, хто за печку, а хто бліжэй дзьвярэй сьціраваўся. Але ксёндз пазнаходзіў усіх і, ня пытаючыся аб згоду, пазапісываў. Пазьней падобным спосабам выбралі ўрад „Stowažyšenia.“ На адзін дзень пасьля Каляд ксёндз загадаў сабраць складкі і зрабіць гарбатку. На гэтую гарбатку, апрача ксяндза, ні з-сюль ні стуль, прыехаў і Вішнеўскі вучыцель — Яворскі, некалішні пэпээсавец, пазьней бэбэк, агітатар за „адзінку“ — адным словам, чалавек партыйны „К. В. Д.“ Сьвінчане добра яго помняць з астатніх выбараў, калі ён, прыехаўшы ў вёску з паліцыяй, абяцаў усім залатыя горы, калі-б галасавалі на „адзінку...“

А вось яшчэ адна „кветачка:“

На Тры Каралі Данюшаўскае „Stowažyšenie“ прыехала „прадстаўляць“ у нашае Вішнева (хто іх з такім прадстаўленьнем сюды прасіў — ня ведаю). Пасьля прадстаўленьня, была вечарынка. На вечарынцы маладзяж папрасіла музыкантаў зайграць лявоніху. Але „стоважышэнцы“ затрымалі музыку і йграць лявоніхі не пазволілі. На запытаньні „чаму“, пачулі такі адказ: што ў „Stowažyšeńni“ нават у пратаколах запісана „жэ на забавах С.М.П. лявоніхі таньчыць ня можна, бо то ест танец **політычны**“... Тут усе госьці змоўклі з зьдзіўленьня з разумовай тупасьці „стоважышэнцаў...“ Усе чулі аб танцах народных, прызнаных і няпрызнаных, модных і нямодных, але аб „палітычных“ першы раз пачулі ад „стоважышэнцаў“ з Данюшава.

Слухайце Данюшаўцы! Кіньце вы на ўсё кругом глядзець праз узьбітыя вам на нос чужыя, туманныя акуляры. Гляньце вы на сьвет сваймі чыстымі вачмі, сваім здаровым мужыцкім розумам. А то, як кажуць, з вас „коні будуць сьмяяцца“...

Гаспадар

Ab haspadarcy.

Vykarmlivańnie śviniej.

I śviniej karmić treba vučycca. Na korm vybirajucca tolki štuki zdarovyja. Dalšym varunkam dobrych vynikaŭ u kormie jość: suchi, ciopły, ale nie za ciomny chleŭ, vaha i ałavok.
Cym praściejšy sposab vykarmlivańnia (pryhatavańnia kormu), tym lepšy.

Najtaniejšym kormam dla žyvioły naahuł, a dla kormnaj, — asabliva, jość korm vyrableny ŭ samaj haspadarcy. I tolki dla dapaŭnieńnia hetych karmavinaŭ, dziela lepšaha vykarystańnia ich, užyvajuć karmavinaŭ fabryčnych dy naahuł dakupnych, napr. miasnaja i rybnaja muka, kuruza i h. d. Treba tolki pry hetym vyścierahacca roznych zachvalanych paraškoŭ.

Nia ŭ kožnuju paru svajho ŭzrostu byvaje śvinčo zdolnym da žyreńnia. Zvyčajna dzielać hetu paru na try časci: pieršaja i druhaja čaść jość paroj pryhatavaŭčaj, a treciaja tolki jość paroj ułaścivaha žyreńnia. Pieršyja dźvie časci pradznačany na toje, kab u parasiaci raźvilisia i vyraśli tyja časci cieła, kudy paśla maje ŭkładacca žyr, dy kab razapchalisia straŭlajučyja orhany (trybuch, kiški) kormnaj žyvioły i stalisia zdolnymi prymać i pieratraŭlać u sabie vialikaje mnostva kormu ŭ paru ŭłaścivaha žyreńnia.

Pryhatavaŭčaja para žyreńnia končycca tady, kali śvinčo pražyvie ŭžo paŭhoda i važyć nia mienš 60—70 kg. (4 pudy). U hetu paru kormicca śvinčo — pieradusim u drobnaj haspadarcy — usim, što tolki ŭ haspadarcy znojdziecca, dy što heta parasio budzie jeści. U hetu paru parasio patrabuje ruchu i jaho nielha ciapier trymać u zamknionym katuchu. Zimoj, akramia taho, kali śvinčo nia moža rycca, jano musić dastać što dzień pa łapacie śviežaj ziamli (hliny).

Uletku najlepšym kormam u hetu paru ŭzrostu parasiaci jość kaniušyna, trava i dobraje paśbišča, a ŭzimku — karmovyja buraki, kaniušynnaja siečka i roznyja miakiny. Da ŭsiaho hetaha na dzień i štuku dadajecca pa adnamu kilahramu zbažžovaha šrotu (hruboj muki), pieradusim jačmienna-kukuruzavaha.

Treciaja para karmleńnia, jnakš zvanaja paroj ŭłaścivaha žyreńnia, jość najvažniejšaj i musić ciahnucca nia bolš troch miesiacaŭ. Samo karmleńnie ŭ hetu paru musić być jak najsilniejšaje: *čym chutčej i silniej prawodzicca ŭłaścivaje žyreńnie, tym taniej jano abojdziecca.*

Žyvioła ŭ hetu paru ŭžo pakidajecca na stała ŭ chlavie, dziennaja porcyja zbažžovych šrotaŭ pavialičajecca da 2—3 kilohramaŭ, a bulby dajecca hetulki, kolki žyvioła patrapić źješci.

Najlepšaj pojłaj dla žyvioły jość čystaja vada, a čystata naahuł jość sakretam i varunkam dobrych vynikaŭ kormu.

inž. A. K.

Выпісвайце „Беларускую Крыніцу“ на 1932 г!

«Б. Крыніца» будзе выходзіць у 1932 годзе па магчымасьці што-тыдня. Будзе стаяць, так як і дагэтуль, на народна-незалежніцкім і хрысьціянска-дэмократычным беларускім грунце. Будзе падаваць стацьці на тэмы палітычныя, грамадзкія, гаспадарчыя, літэратурныя і касьцельна-царкоўныя. У кожным нумары наш чытач знойдзе зьмест усіх цікавейшых падзеяў з палітычнага жыцьця краю і загранiцы. Будзем зьмяшчаць ня толькі з беларускага жыцьця ў Польшчы, але так-жа ў Саветах, у Латвіі, у Амэрыцы і іншых краёх. „Б. Крыніца» мае сваіх карэспандэнтаў загранiцай, якія будуць прысылаць нам весткі з тамашняга жыцьця, а так-жа выразкі з загранічных, а ў тым ліку і з савецкіх газэт.

«Б. Крыніца“ будзе ня толькі інфармаваць сваіх чытачоў, што дзеецца ў краі і загранiцай, але будзе чэсна і адважна змагацца за поўныя правы Беларускага Народу ў Польшчы, гэтак як гэта рабіла дагэтуль.

Падпіска на «Б. Крыніцу“ ў год каштуе 4 зл., на паўгода —2 зл. на 3 месяцы—1 зл.

Грамадзяне! Выпісвайце і пашырайце нашу часопісь!

Не павінна быць ніводнай вёскі ў Зах. Беларусі, куды-б не даходзіла «Б. Крыніца!“

Жадайце высылкі пробных нумароў!

УВАГА!
Беларуская Кнігарня «ПАГОНЯ» перанесена з Людвісарскай 1, на ЗАВАЛЬНУЮ 6—10.

Рэдактар Ян Пазьняк.

Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня.

Выдавец А. Шутовіч.